накаліберны кулямёт, іншае ўзбраенне і доўга супраціўляліся. Байцы ўзялі ў палон лётчыка і перадалі яго ў абласны ваенкамат, а стралок і радыст былі забіты.

Жнівеньскія дні 1941 г. былі заняты арганізацыяй сувязі паміж падполлем Мазыра і раёнаў вобласці. 20 жніўня па заданні сакратара АК КП(б)Б Турыка і старшыні аблвыканкама Зайцава я з супрацоўнікам Чыгіром выехаў у Хойніцкі і Брагінскі раёны, каб падрыхтаваць базы ўзбраення і харчоў, наладзіць з мясцовым кіраўніцтвам сувязі.

20—21 жніўня 1941 г. у Брагіне мы займаліся стварэннем партызанскага атрада. У яго былі ўключаны работнікі партыйнага апарата, міліцыі і іншыя актывісты. Турык і Зайцаў паехалі ў Чарнігаў, дзе ў гэты час знаходзіўся штаб 21-й арміі, членам Ваеннага савета якой быў П. А. Лявіцкі.

Калі яны вярнуліся ў Брагін, нам было прапанавана адшукаць начальніка Палескага ўпраўлення НКУС І. Н. Івашчанку і паступіць у яго распараджэнне. У канцы жніўня мы знайшлі Івашчанку ў Болхаве Арлоўскай вобласці. Ён сказаў, што па ўказанні Наркамата ўнутраных спраў СССР усе супрацоўнікі органаў з Палескай вобласці павінны на месцы кіраваць партызанскім рухам і патрыятычным падполлем. Нам было загадана выехаць на фронт у напрамку Палескай вобласці і па заданні асобых аддзелаў весці разведку праціўніка. Шлях наш ляжаў назад, у занятую к гэтаму часу ворагам вобласць.

## Чорныя дні акупацыі

Акупіраваўшы Палессе, Мазыр і раён, гітлераўцы пачалі ўстанаўліваць свой «новы парадак». Людзі пазбаўляліся ўсіх правоў на чалавечае існаванне, бо знішчаліся ўстановы культуры, асветы, аховы здароўя, а ўрэшце гэта быў крывавы чалавеканенавісніцкі рэжым масавага знішчэння насельніцтва.

Тэрыторыя Беларусі была падзелена на часткі. Паўднёвыя раёны Палескай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей былі адарваны ад Беларусі і далучаны да рэйхкамісарыята Украіны. На Палессі ўтварылі чатыры акругі — Мазырскую, Васілевіцкую, Ельскую і Петрыкаўскую, якія падпарадкоўваліся жытомірскаму гебітскамісарыяту. У гарадах і райцэнтрах з'явіліся назначаныя акупантамі бургамістры, у сельскай мясцовасці — старасты. Былі створаны паліцэйскія ўчасткі, лагеры, гета.

Кожнага, хто выклікаў хоць невялікае падазрэнне акупацыйных улад, арыштоўвалі, адпраўлялі ў турмы ці лагеры, адкуль мала хто мог выйсці жывым. У першую чаргу забівалі камуністаў, камсамольцаў, савецкіх работнікаў, калгасных актывістаў. Поўнаму знішчэнню падлягала яўрэйскае насельніцтва Мазыра і раёна. З восені 1941 г. па вясну 1942 г. адбываліся масавыя расстрэлы яўрэяў, якія не паспелі эвакуіравацца ў савецкі тыл.

З ростам партызанскага руху, узмацненнем супраціўлення захопнікам узмацняліся і рэпрэсіі. У шалёнай ярасці гітлераўцы знішчалі мірнае насельніцтва, жанчын, дзяцей, старых. Часта людзей забівалі па стандартным абвінавачанні «за сувязь з партызанамі».

Ад расстрэлаў асобных людзей гітлераўцы перайшлі да масавага знішчэння насельніцтва многіх вёсак раёна. 22 сакавіка 1943 г. у вёсцы Казіміраўка былі расстраляны 358 чалавек, у тым ліку жанчыны і дзеці, спалена 76 хат. У той жа дзень у Будзе Казіміраўскай было забіта 127 жыхароў, спалена 32 хаты. У чэрвені 1943 г. была спалена вёска Раманаўка, забіта 30 сялян.

Жудасную расправу ўчынілі гітлераўцы над жыхарамі вёскі Касцюковічы, дзе 30 чэрвеня 1943 г. былі кінуты

жывымі ў калодзежы і спалены каля 200 чалавек. У сям'і Цімафея Місевіча, напрыклад, загінулі страшнай смерцю яго жонка Пелагея, дарослы сын Мікалай і пяцёра дзяцей ад 3 да 14 гадоў. У крывавай расправе ўдзельнічалі абверкаманда 10-СА (начальнік К. Крыстман) і мазырская паліцыя.

Былі спалены многія вёскі раёна. Ад рук акупантаў у раёне загінула звыш 1770 чалавек, а ў Мазыры за час акупацыі гітлераўцы і іх памагатыя забілі і закатавалі больш як 5500 чалавек. З раёна на катаржную працу ў Германію было вывезена звыш 1800 чалавек.

Акупанты лічылі, што такім чынам яны запалохаюць насельніцтва, прымусяць яго поўнасцю падпарадкавацца іх «новаму парадку», згадзіцца з рабскім існаваннем.

Але атрымалася наадварот. Як і на ўсёй тэрыторыі Беларусі, на Мазыршчыне разгарнуўся ўсенародны рух супраціўлення ворагу.

*А. Васько*

## З ЛІСТОЎКІ МАЗЫРСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКАМА КП(б)Б

*3 верасня 1943 г.*

...У 220 дзяцей, бацькоў якіх пагналі ў праклятую Нямеччыну, у г. Мазыры бяруць кроў для раненых фашыстаў. Да чаго толькі дакаціліся гітлераўскія падлюгі...

Усю вопратку і хлеб, закапаныя жыхарамі ў вёсцы Мялешкавічы, гітлераўцы забралі, а ямы напоўнілі трупамі расстраляных людзей. Усіх злачынстваў гітлераўскіх катаў не пералічыць. Ці можна ім усё гэта дараваць? Ніколі! Ім няма, не можа быць і не будзе ніякай літасці!

Партызаны! Да помсты кліча кроў замучаных бацькоў, матак, братоў, сясцёр.

Біце фашыстаў, адсякайце іх крывавыя лапы!

Вечнае праклянцце гітлераўскім катам!

Выданне Мазырскага падпольнага райкама КП(б) Беларусі.

*Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы. Мн., 1952. С. 207.*

## Адных забівалі, другіх палілі...

### З успамінаў Н. Ф. Марціновіч, былой жыхаркі в. Спрымачоў

У вайну мне не было і дзесяці гадоў, а ўсяго нас, дзяцей, было пяцёра. Малодшы брацік нарадзіўся ўлетку 1941 г. Колькі мы нацярпеліся!..

Бабулю фашысты спалілі. Сястру Фросю, ёй было васемнаццаць гадоў, хацелі таксама спаліць. Яна цудам выратавалася з палаючага будынка. Калі дым напоўніў памяшканне, Фросі ўдалося непрыкметна выскачыць праз акно ў каморы і ўцячы ў лес. Увечары вярнулася. Маці думала, што яна ўжо загінула... Але страшныя пакуты чакалі нас наперадзе.

Калі карнікі палілі Спрымачоў, мы ўцяклі, рассыпаліся як гарох у розныя бакі. Навокал моцная страляніна, людзі беглі хто куды, і мы з імі. Нас схавала суседка ў хмызняку. Маці і старэйшую сястру згубілі. Немцы, як маглі, здзекаваліся з мірных жыхароў, большасць з іх забілі. На маіх вачах фашыст падняў на штык немаўля ў пялёнках, якое маці схавала ў траве каля лазовага карча...

Нам пашанцавала, засталіся жывымі, хоць немцы ўсё ж злавілі нас і пагналі ў Германію на пакуты.

## Цяжка ўспамінаць...

**Расказвае жыхарка в. Жахавічы Д. С. Леановіч**

...Канец ліпеня 1943 г. Пайшла я ў поле жыта жаць. Дзяцей кінула дома. Я хоць была маладая, а ўжо трое дзяцей на руках мела... Дык вось пайшла... Кажу сваім: «Будзьце дома, а я пайду пажну». Дайшла да лесу, чую: машыны равуць. Наталля, суседка, кажа: «Мо самалёты?» А я крычу: «Цётка, машыны!» А тут страляць пачалі. Як загалашу! Каб жа ведала, то дзяцей з сабою забрала б... Я ўжо не знаю, куды бегчы. Ці па дзяцей, ці далей уцякаць. Усе з вёскі бягуць у лес. А я, наадварот, з лесу бягу ў вёску, бо што ж я без дзяцей?! Дзе ж маё сэрца будзе мацярынскае?!

З таго пуду бягу дзяцей ратаваць. Прыбягаю — а ў мяне яшчэ бабуля была, маёй маткі маці. Яна ўжо клункі пазгортвала, пазвязвала. Мяне ўбачыла, загаласіла: «Чаго ж ты прыбегла, нас паб'юць, то хоць бы засталася!» Кажу: «Што будзе дзецям, і мне тое». Ужо мы тыя клункі пазвязвалі, ужо нас да вазоў павялі. Людскія пажыткі пачалі на вазы грузіць. Якраз у Жахавічах было чацвера коней. Куды ж павядуць?..

Пачалі нас сартыраваць. Партызанскія сем'і — у левую старану, а нас — у правую. У мяне муж на фронце быў. Немцы з паліцаямі тыя клункі паразвязвалі, лепшае сабе пазабіралі.

Адвялі нас далей ад вёскі. Мо метраў трыццаць, а чуем па дзярэўні: «Бах! Бах!» Запальнымі кулямі. І быстра ж так усё гарыць. Палаюць Жахавічы. Мы едзем і галосім. Авечкі бекаюць, худоба раве, дзеці галосяць, мы галосім...

А там адзін калодзеж з аднае стараны, другі — з другое. Абодва зямлёй пазасыпаныя. Зямля ходзіць як жывая. То ж людзей у калодзеж пакідалі жыўём і пазасыпалі. А партызанскія сем'і расстрэльвалі на яўрэйскіх могілках. У дзевяці ямах...

## З ПАКАЗАННЯЎ ЦАРАПІНА МАЙСЕЯ ПЯТРОВІЧА АБ АКУПАЦЫІ МЯСТЭЧКА СКРЫГАЛАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ Ў 1941—1943 гг.

Оккупировав м. Скрыгалов, немецко-фашистские власти прежде всего уничтожали активистов Советской власти и еврейское население. 15.1.1942 г. прибывший отряд СД и местная полиция собрали еврейские семьи в одно помещение — к Фридману Нохиму. Всего 45 душ. Вывели из помещения на польское кладбище в 500 метрах от Скрыгалова и расстреляли из пулемета.

Гражданку Гельтман Лукерью с ребенком расстреляли за то, что была замужем за евреем.

В сентябре 1941 г. арестованного активиста Советской власти Падило Павла Степановича полицаи по команде жандарма положили на землю, накрыли его бороной зубьями вниз. На борону положили колоду. Павел от страшной боли тут же скончался.

С первых же дней оккупации фашисты начали вылавливать красноармейцев, не успевших отступить с частями Красной Армии и оставшихся жить в деревнях. Их объявили военнопленными. Одного военнопленного красноармейца по имени Аркадий мучили голодом, потом избили до потери сознания и пристрелили. Таким же мучительным пыткам немцы и полицаи подвергли в 1941 г. четырех пленных красноармейцев.

Всего по местечку было расстреляно и замучено ни в чем не повинных граждан 83 человека, увезено в Германию 40 человек.

З дакументаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 72. Воп. 1. Спр. 241. Л. 85—86.*

## Такое забыць нельга

Адной з самых жахлівых праяў фашысцкага акупацыйнага рэжыму быў генацыд у адносінах да яўрэйскага насельніцтва. Па ўказанні Гітлера летам 1941 года пачалі распрацоўваць планы «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання». Гэтае «канчатковае вырашэнне» азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў. Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Германа Эйхмана, якому Гітлер даручыў правядзенне ў жыццё гэтай праграмы, было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што складала трэцюю частку яўрэяў усяго свету[1].

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з бяспрыкладнай жорсткасцю ажыццяўлялі на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку на Мазыршчыне. У снежні 1941 г. у раёне Рамашоў Роў было створана яўрэйскае гета, дзе людзі жылі ў невыносных умовах.

Напярэдадні новага 1942 г. гітлераўцы арганізавалі масавы расстрэл насельніцтва гета. Звыш 700 чалавек утапілі ў Прыпяці. Частка людзей, якіх папярэдзіў падпольшчык Крыцкі, паспела схавацца і пражыць яшчэ некаторы час. Апошнія ахвяры гета былі расстраляны ў чэрвені 1942 г. Расстрэлам кіравалі начальнік жандармерыі обер-лейтэнант Тыццэ, обер-вахмістр Урліх і начальнік мазырскай паліцыі Падбярэзны, які выдзеліў «у дапамогу» нямецкай жандармерыі 10 паліцаяў. Масаваму знішчэнню падвергліся і цыганы, што на той час знаходзіліся ў Мазыры і на тэрыторыі раёна.

Успаміны людзей, што ўратаваліся ад смерці ў час крывавых антыяўрэйскіх акцый, пераканаўча сведчаць аб тым, як фашысцкі рэжым «вырашаў яўрэйскае пытанне» на Мазыршчыне.

[1] Приговор Международного Военного трибунала. Сборник «Нюрнбергский процесс». М., 1961. Т. 7. С. 401–402.

## З успамінаў Д. Д. Шульман

Мая цётка Р. Л. Шнітман у часы нямецка-фашысцкай акупацыі жыла на станцыі Мазыр са сваім бацькам і дзвюма дочкамі трох і пяці гадоў. Муж яе знаходзіўся на фронце. Калі ў 1941 г. пачаліся масавыя расстрэлы яўрэяў, Роза Лейбаўна з бацькам і дзецьмі, узяўшыся за рукі, пайшлі ў Прыпяць і ўтапіліся. У 1945 г. вярнуўся з фронту яе муж. Ад суседзяў даведаўся аб гібелі жонкі, дзяцей і цесця. Пражыў ён нядоўга, ад раненняў і гора хутка памёр.

## З успамінаў Ф. М. Курцэр

У пачатку вайны мае бацька і маці эвакуіраваліся з горада. Маці трапіла ў акружэнне і загінула, бацька не вярнуўся з фронту. Загінулі і мае два браты, Хаім і Арон. Я засталася з дзецьмі трох і пяці гадоў – Валяй і Валодзем. У пачатку акупацыі нямецкія карныя органы распачалі масавае знішчэнне мірнага насельніцтва. Асабліва жорстка яны адносіліся да яўрэяў і тых, каго падазравалі ў сувязях з партызанамі. Днём і ноччу не сціхалі стрэлы ў Мазыры і яго ваколіцах. Я бачыла, як псіхічна хворы мазыранін кінуўся з палкай на нямецкага афіцэра і тут жа быў застрэлены. Забілі гітлераўцы і майго дзеда Лазара Мільмана.

У верасні 1941 г. я бачыла расстрэл сям'і з трох чалавек. Іх гітлераўцы падазравалі ў захоўванні прадуктаў і вопраткі для партызан. Многіх мазыран-яўрэяў заганялі ў Прыпяць і там расстрэльвалі. Да студзеня 1942 г. усё яўрэйскае насельніцтва было сагнана ў гета па вуліцы Рамашоў Роў. Там была і я з дзецьмі. У пачатку 1942 г. адною ноччу немцы пачалі масавы расстрэл яўрэяў. У загадзя вырытыя траншэі кідалі і забітых і жывых, засыпалі ўсіх зямлёй.

Калі нас вялі на расстрэл, мне ўдалося з дзецьмі ўцячы з калоны і дабрацца да Васілевіч. Там я ўладкава-

лася ў камісарыят прыбіральшчыцай. Перад вызваленнем Васілевіч, у канцы 1943 г., мяне вывезлі ў Германію. Працавала ў баўэра. Вясной 1945 г. нас вызваліла Чырвоная Армія.

**З успамінаў Р. А. Шэрман**

У гады вайны я была эвакуіравана на ўсход, вярнулася ў родны горад у верасні 1944 г. Суседзі, якія перажылі нямецкую акупацыю, расказалі мне, як нямецкія карнікі расстрэльвалі, вешалі, тапілі мазыран, асабліва яўрэяў. Каб пазбегнуць здзекаў і пакут, яўрэі спрабавалі ўцякаць, хавацца і нават канчалі жыццё самагубствам.

Так, у канцы 1941 г. вялікая група старых яўрэяў, якія не маглі схавацца або ўцячы, вырашылі спаліць сябе ў доме № 19 па вул. Пушкіна, па суседстве з домам, дзе я жыла да вайны. У доме сабралася да 40 чалавек. Падпаліць дом па жэрабю павінна была Гафштэйн Хая, якая і зрабіла гэта падрыхтаваным факелам. Згарэлі гаспадар дома Гафштэйн Эля, яго жонка Фейга, нявестка Соша, суседзі Гафштэйн Эер, ягоная жонка Хая, сын Шлёма, Коган Іслаэль і іншыя.

Пасля вайны некаторыя жыхары Мазыра спрабавалі на месцы былога пажару пабудаваць дом. Але адмаўляліся ад гэтай задумы, бо пры падрыхтоўцы пляцоўкі выкопвалі шмат чалавечых касцей.

**З успамінаў К. У. Харавец**

Я бачыла жудасныя злачынствы, якія ўчынялі акупанты. У 1941 г. я пешшу хадзіла ў Магілёў, дзе быў вялікі лагер савецкіх ваеннапалонных. Там, па звестках, знаходзіўся мой шваґер. З вялікімі цяжкасцямі я адшукала яго і выпрасіла ў немцаў. Ён быў змардаваны, вельмі худы.

Паўз наш дом гітлераўцы вадзілі на расстрэл людзей — туды, дзе сёння трыкатажная фабрыка і СШ № 4. Асуджаных на смерць прымушалі капаць сабе яму-магілу. Мне давялося бачыць знявечаных падпольшчыкаў Казачэнку, Міцуру, Майсеева, Канаша перад расстрэлам.

Была я сведкай і масавых расстрэлаў яўрэяў у раёне цяперашняга Кургана Славы. Іх вадзілі сюды па панядзелках і серадах. Расстрэльвалі яў-



Расстрэл мірных жыхароў Мазыра. 1943



Былы вязень канцлагера Баклеева Алена Савельеўна. Фота 1946 г.

рэяў і на тэрыторыі, дзе цяпер пэдінстытут. Помню, было гэта ў каляднае свята. У немцаў граў патэфон, даносіліся гукі іх маршаў...

Аднойчы на яўрэйскія могілкі гітлераўцы прывялі на расстрэл старога партызана з унукам-хлопчыкам гадоў пяці-сямі. Прымусілі старога капаць магілу, хлопчык плакаў...

**З успамінаў А. М. Ваера**

У пачатку вайны нам эвакуіравацца не ўдалося. Для барацьбы з варожымі дыверсантамі ствараліся знішчальныя батальёны з моладзі, якая не была мабілізавана на фронт. Пайшоў туды і я разам са сваім сябрам Мішам Салянікам. Нас уключылі ў групу разведкі. Саляніку выдалі вінтоўку, а мне, невысокаму ростам, чэхаславацкі карабін. Даручылі ахоўваць будынак абкама камсамола.

З набліжэннем фронту батальён пакінуў горад, але мне аб гэтым ніхто не паведаміў. Я не ведаў, дзе шукаць сваіх, і застаўся адзін. Маці параіла мне ісці з горада. Падаўся я ў вёску Кустаўніца. Мясцовыя здраднікі аб'явілі мяне партызанам, а маці маю, як яўрэйку, хацелі расстраляць. У гэты час у вёску прыйшла савецкая дыверсійная група і вызваліла нас. Тыя, хто нас хацеў забіць, былі расстраляны...

Маці вырашыла ісці ў вёску Навікі, дзе жыла яе стрыечная сястра з дочкамі. Аднойчы яны паслалі мяне ў Мазыр па соль. Гэта было складана. У горадзе я сустрэў цётку Голду з жоўтымі нашыўкамі на паліто, спераду і на спіне, — такія нашыўкі загадвалі насіць яўрэям.

Сярод ночы пачалася страляніна. Мы схаваліся ў склепе. Раніцай паліцэйскія нас адшукалі і выцягнулі. Дзяцей сагналі ў адзін дом. Потым усіх вывелі на вуліцу, пастроілі ў рады, скамандавалі ўзяцца за рукі і павялі. Куды нас гоняць, мы ведалі, усе плакалі. У канцы вуліцы Саета мяне аклікнуў паліцэйскі. Ён да вайны працаваў у міліцыі і часта дзяжурыў на плошчы Леніна, ведаў мяне. Спытаў, як я сюды трапіў. Падышоў да другіх паліцэйскіх і штосьці ім сказаў. Мяне вывелі з калоны. Дзяцей павялі да Прыпяці. Іх на маіх вачах напаткаў горкі лёс. Усіх загналі ў раку і расстралялі. Тую жудасную карціну я не здолею забыць да канца свайго жыцця...

Падрыхтаваў да друку

*І. Пілінчук*

**Населеныя пункты Мазырскага раёна, знішчаныя гітлераўцамі і не адноўленыя пасля Вялікай Айчыннай вайны**

Вёска Спрымачоў, у якой налічвалася 20 двароў і пражывала 123 чалавекі, знішчана 5 чэрвеня 1943 г. і пасля вайны не аднавілася. Такі ж лёс спасцігнуў і пасёлак на 27-м км вузкакалейнай чыгункі Ельск — Лельчыцы, каля в. Забалацце, дзе было 4 двары і жыло 18 чалавек. Пасёлак быў знішчаны карнікамі 28 ліпеня 1943 г. і не аднавіўся.

**Бяроза, дубок, тры сасонкі...**

Бяроза, дубок ды тры сасонкі... Гэта ўсё, што засталося ад вёскі Спрымачоў Асавецкага сельсавета, якая загінула ў агні ў 1943-м разам з большасцю яе жыхароў.

Прыгожыя тут мясціны... Паляны, густыя лясы і цяжкапраходныя балоты. Па лясных дарогах іншы раз цяжка

## Населеныя пункты
## Мазырскага раёна, поўнасцю або часткова знішчаныя і адноўленыя пасля Вялікай Айчыннай вайны

| Населены пункт | Двароў | Жыхароў | Знішчана | | Час правядзення акцыі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | двароў | жыхароў | |
| Асавец | 96 | 457 | 96 | 74 | чэрвень 1943 г. |
| Асавецкая Буда | 31 | 153 | 31 | 9 | чэрвень 1943 г. |
| Балажэвічы | 165 | 727 | 165 | 42 | студзень 1943 г. |
| Барыскавічы | 179 | 867 | 4 | 23 | студзень 1944 г. |
| Белая | 86 | 268 | 24 | 21 | студзень 1944 г. |
| Буда-Казіміраўская | 32 | 233 | 32 | 131 | 22 сакавіка 1943 г. |
| Булаўкі | 48 | 246 | 4 | 1 | студзень 1944 г. |
| Васькаўка | 70 | 319 | 6 | 11 | ліпень 1943 г. |
| Гіневічаў Груд | 54 | 243 | 51 | 6 | ліпень 1943 г. |
| Глініца | 144 | 722 | 144 | 35 | снежань 1942 г. |
| Дзербінка | 63 | 281 | 63 | 30 | 14 ліпеня 1943 г. |
| Жахавічы | 200 | 1000 | 200 | 52 | 30 ліпеня 1943 г. |
| Забалацце | 67 | 320 | 61 | 46 | сакавік 1943 г. |
| Заводны Востраў | 76 | 396 | 76 | 32 | 5 жніўня 1943 г. |
| Зімавая Буда | 57 | 253 | 57 | 9 | лістапад 1942 г. |
| Зімовішчы Вялікія | 96 | 307 | 96 | 11 | чэрвень 1943 г. |
| Зімовішчы Малыя | 126 | 390 | 126 | 27 | чэрвень 1943 г. |
| Зялёны Мох | 54 | 221 | 54 | 11 | 26 ліпеня 1943 г. |
| Казіміраўка | 76 | 420 | 76 | 372 | 22 сакавіка 1943 г. |
| Камень | 34 | 169 | 34 | 30 | чэрвень 1942 г. |
| Каменка | 84 | 328 | 84 | 20 | ліпень 1943 г. |
| Касцюковічы | 150 | 468 | 150 | 162 | 30 чэрвеня 1943 г. |
| Крушнікі | 72 | 288 | 72 | 19 | чэрвень 1943 г. |
| Крынічная Града | 29 | 88 | 26 | 5 | снежань 1942 г. |
| Летавішчы | 19 | 80 | 19 | 15 | ліпень 1943 г. |
| Лешня | 245 | 686 | 233 | 34 | ліпень 1943 г. |
| Лубня | 60 | 320 | 59 | 2 | чэрвень 1943 г. |
| Майсееўка | 109 | 340 | 109 | 50 | жнівень 1943 г. |
| Махнавічы | 197 | 893 | 197 | 71 | 13 чэрвеня 1943 г. |
| Млынок | 23 | 79 | 23 | 8 | 24 ліпеня 1943 г. |
| Мялешкавічы | 370 | 860 | 370 | 90 | 24 ліпеня 1943 г. |
| Надаткі | 64 | 200 | 17 | 20 | 1943 г. |
| Падлядзічы | 35 | 158 | 35 | 8 | 12 чэрвеня 1943 г. |
| Перадрэйка | 60 | 235 | 60 | 51 | ліпень 1943 г. |
| Прудок | 175 | 793 | 13 | 34 | студзень 1944 г. |
| Раманаўка | 98 | 383 | 98 | 28 | чэрвень 1943 г. |
| Рудня Каменская | 35 | 125 | 35 | 9 | ліпень 1943 г. |
| Скалодзін | 59 | 250 | 59 | 32 | снежань 1942 г. |
| Скрыгалаў | 334 | 1093 | 219 | 109 | 1943 г. |
| Слабада | 264 | 845 | 23 | 98 | 1943 г. |
| Турбінка | 36 | 196 | 36 | 2 | ліпень 1943 г. |
| Хамічкі | 101 | 312 | 7 | 21 | ліпень 1943 г. |
| Шчакатава | 68 | 177 | 68 | 20 | ліпень 1943 г. |

*Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі. Мн., 1995.*

было не тое што праехаць, але і прайсці. А навокал раздолле...

У гады першай сусветнай і грамадзянскай войнаў жыхары Спрымачова ваявалі на франтах і ў партызанскіх атрадах. У трыццатыя гады стварылі калектыўную гаспадарку. Была адкрыта пачатковая школа, магазін. Палепшаны дарогі. Толькі б жыць ды радавацца...

Бяда прыйшла ў Спрымачоў у 1937 г., калі за некалькі начэй былі арыштаваны і вывезены невядома куды каля двух дзесяткаў мужчын — «ворагаў народа»... Гэта былі лепшыя працаўнікі вёскі. Але ў якіх толькі грахах не абвінавачвалі іх! Людзі зніклі назаў-

сёды. Дзесяць з іх, як стала вядома, ляжаць у мазырскай зямлі, астатнія загінулі невядома дзе.

Вайна... Мужчыны, што яшчэ былі ў вёсцы, пайшлі на фронт, у партызанскія атрады. Засталіся дзеці, жанчыны, старыя. Фашысцкія карнікі жорстка адпомсцілі мірным жыхарам за свае няўдачы, за смелыя аперацыі партызан.

Ворагі накінуліся на вёску, як зграя дзікіх драпежнікаў, на досвітку 5 чэрвеня 1943 г. Тых, хто не паспеў схавацца, расстралялі ці спалілі ў хатах. А ў адну з хат загналі больш за сто чалавек жыхароў навакольных вёсак, што хаваліся ў лясах, і таксама падпалілі. Колькі людзей загінула тут у тую летнюю раніцу... Невядома і сёння.

Закончылася вайна. Жыхары Спрымачова, што засталіся жывымі, пабудавалі на былых селішчах зямлянкі. Але з цягам часу разышліся па навакольных вёсках. Засталася пустка...

Сярод збажыны, што наліваецца штогод у гадавіну трагедыі важкім коласам, на месцы вёскі расце бяроза, да якой прытуліўся дубок, побач — тры сасонкі. Яны абкружылі абеліск — выяву маці ў жалобе, якая плача аб загінуўшых родных, аб вёсцы, што знікла з твару зямлі, аб забытых магілах...

*М. Капач*

# Ахвяры фашысцкага тэрору

## ГОРАД МАЗЫР

З актаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў:

...В Мозырской тюрьме и застенках других немецких карательных организаций было умерщвлено немцами не менее 350 человек. Все еврейское население города, главным образом женщины, дети и старики осенью 1941 года были собраны в «гетто» по ул. Ромашов Ров, где затем были расстреляны или потоплены в реке.

Всего расстрелянных, замученных граждан — 5530 человек, из них расстреляно — 4730 человек. В ходе расследования обнаружено:

На еврейском кладбище — 18 могил, число трупов в каждой от 50 до 55 человек.

На ул. Пушкина, на бывшей усадьбе тюрьмы — 5 могил — 275 человек.

В урочище Ромашов Ров в овраге — 4 могилы — 850 трупов.

В овраге на пути из г. Мозыря в д. Бобры — 2 могилы — 1000 человек.

В конце ул. Свидовка — 2 могилы — 600 человек.

Часть расстрелянных зарывалась в землю живыми.

Извлечено трупов — 4032.

*ДАРФ. Ф. 7021. Воп. 91. Л. 6—19.*

Камісіі па падрыхтоўцы гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» удалося ўстанавіць імёны толькі 623 закатаваных і расстраляных жыхароў.

**Загінулі ў 1941 г.**

**БЕКЕРМАН** Абрам Майсеевіч (1902 г.)
**БЕКЕРМАН** Бейля Абрамаўна (1902 г.)
**БЕКЕРМАН** Доба Абрамаўна (1918 г.)
**БЕКЕРМАН** Рыгор Абрамавіч (1937 г.)
**ВАЙСМАН** Меер Юдкавіч (1867 г.)
**ГАМБУРГ** Моталь (1870 г.) і яго дзеці **Абрам** (20 гадоў) і **Рахіль** (18 гадоў)
**ГАМБУРГ** Рыва Абрамаўна (1880 г.)
**ГАРЭЦКАЯ** Геня (16 гадоў), **Фрыда** (5 гадоў) і **Янкель** (4 гады)
**ГРАЙФЕР** Хана Якаўлеўна (1911 г.) і яе дзеці **Геня** (10 гадоў), **Паліна** (8 гадоў) і **Лёва** (1 год)
**ГУХМАН** Бася Мееравна (1860 г.)
**ГУХМАН** Янкель Юдавіч (1860 г.)
**ДУБРАЎ** Аляксей Мікалаевіч (1890 г.), старшыня калгаса, расстраляны ў лістападзе 1941 за сувязь з партызанамі.
**ЖУКОЎСКАЯ** Марыля Лаўрэнцьеўна (1898 г.)